УДК [395+82-97](476.5-21)“16”

*В. У. Чараўко*

# «Дзённік Полацкага Сафійскага манастыра» як крыніца па практыцы пахавання вышэйшага духавенства ў XVII—XVIII стст.[1]

*Артыкул прысвечаны аналізу звестак аб пахаваннях біскупаў уніяцкай царквы, выяўленых у Полацкім Сафійскім саборы. У XVII—XVIII стст. біскупаў хавалі ў нішах у сьценах храма. Пахавальны інвентар адпавядаў адзенню біскупа і адлюстроўваў статус пахаванага.*

*Ключавыя словы: пахавальная практыка; пахаванне біскупа; Полацкі Сафійскі сабор.*

***Уводзіны***. Пахавальная практыка насельніцтва беларускіх земляў перыяду позняга сярэднявякоўя — ранняга новага часу параўнальна нядаўна стала прадметам мэтанакіраванага даследавання. Яе вывучэнне з’яўляецца перспектыўным напрамкам навуковага пошуку. Асноўны аб’ём інфармацыі па гэтай праблематыцы даюць археалагічныя крыніцы, якія дазваляюць прасачыць асаблівасці пахавальнага абраду (заканамернасці размяшчэння пахаванняў, наяўнасць трун, пахавальнага і памінальнага інвентару, надмагільных канструкцый) і яго развіццё. З пісьмовых крыніц найбольш шматлікімі з’яўляюцца тастаменты (завяшчанні). У іх можна сустрэць просьбы складальніка аб адказных за арганізацыю пахавання асобах, указанні на месца пахавання, пажаданні адносна цырымоніі і рэлігійных абрадаў [6, с. 192—194]. Найбольш плённым з’яўляецца комплекснае выкарыстанне даных археалагічных і пісьмовых крыніц.

Нашыя веды пераважна датычацца пахавальнай практыкі, пашыранай у асяроддзі сялянства, мяшчанства, шляхты. Асобныя крыніцы дазваляюць убачыць спецыфіку пахаванняў колькасна нешматлікіх, але ўплывовых сацыяльных груп насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага.

[1] Работа выканана ў межах праекта Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў «Пахавальныя помнікі Полацка XI—XVIII стст. у кантэксце развіцця сінхронных некропалей Беларускага Падзвіння: пахавальны абрад, інвентар, палеаантрапалагічная характарыстыка» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20221071 ад 06.07.2022).

Адной з такіх крыніц з'яўляецца «Дзённік Полацкага Сафійскага манастыра», які ўтрымлівае звесткі аб пахаваннях архірэяў уніяцкай царквы [2, с. 340—378]. Мэтай артыкула з'яўляецца аналіз звестак аб пахаваннях, што ўтрымліваюцца ў згаданай крыніцы, і вызначэнне спецыфікі пахавальнай практыкі вышэйшага ўніяцкага духавенства XVII—XVIII стст.

***Асноўная частка.*** «Дзённік Полацкага Сафійскага манастыра, пачаты ў 1746 г.», — рэдактарская назва апавядальнай крыніцы «Acta monasterii Polocensis S. Sophiae…». Яе поўнае па-барочнаму пышнае найменне складаецца з пяцідзесяці слоў. Яна з'яўляецца не дзённікам, а манастырскай хронікай. Хроніка пачала весціся па даручэнні настаяцеля Сафійскага манастыра, генеральнага вікарыя і афіцыяла полацкага ўніяцкага архіепіскапа Іраклія Лісянскага. Яна апісвае падзеі, якія адбываліся ў 1745—1767 гг. [2, с. 340; 5, с. 167]. «Дзённік…» надрукаваны ў дзясятым томе серыйнага выдання «Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа» ў 1874 г. Ва ўводзінах да зборніка паведамляецца, што з дзённікаў базыльянскіх манастыроў надрукавана толькі тое, што здалося выдаўцу «колькі-небудзь цікавым у гістарычных адносінах» [2, с. VIII].

Каштоўнымі для вывучэння пахавальных традыцый з'яўляюцца два фрагменты «Дзённіка…». Першы апісвае знаходку ў Сафійскім саборы пахавання ў архірэйскіх строях. Прывядзем яго ў перакладзе з лацінскай мовы.

*1747 год. Сакавік месяц. На 20 дзень увечары царкоўныя рабочыя разбурылі сцяну царквы, што стаяла на беразе Дзвіны, і знайшлі ў ёй грабніцу, дзе былі адшуканы косці ў архіепіскапскім убранні: сакасе, амафоры і г. д. На нагах былі туфлі, як у каталіцкіх біскупаў, з крыжамі на насках, якія носяць каталіцкія біскупы ў час набажэнстваў.*

*Схізматыкі дужа абураліся, кажучы, што каталіцкія біскупы носяць крыжы на туфлях, каб схіліць да папства.*

*Таксама знойдзены крыж-каравака з рэліквіямі. Таксама было епіскапскае ўбранне, што завецца параман, з выявамі Дзевы Марыі, св. пантыфіка Аляксандра, святых Антонія, Васіля і іншых;*

*Сталыя людзі казалі, што гэта былі парэшткі Антонія Сялявы, архіепіскапа Полацкага, які быў [епіскапам] адразу пасля блажэннага Іасафата [Кунцэвіча], і таму павінен быў быць пахаваны ў сцяне капліцы блажэннага Іасафата. Аднак, больш верагодна, што гэта [парэшткі Гедэона] Бральніцкага* [2, с. 343].

Год знаходкі пахавання епіскапа добра суадносіцца з гістарычным кантэкстам. У час Паўночнай вайны ў Сафійскім саборы знаходзіўся парахавы склад арміі Пятра І. Выбух пораху ў 1710 г. амаль знішчыў

старажытны храм. У 1738—1750 гг. на яго руінах на сродкі полацкага ўніяцкага архіепіскапа Фларыяна Грабніцкага была ўзведзена Сафія ў яе сучасным выглядзе [3, с. 450]. Адпаведна, знойдзеная ў 1747 г. архірэйская грабніца была выяўлена ў час адбудовы сабора пры разбурэнні рабочымі-будаўнікамі фрагмента старой сцяны (які ці з'яўляўся недастаткова надзейным для ўключэння ў новы будынак, ці не ўпісваўся ў яго).

Паводле аўтара «Дзённіка…», пахаванне адкрылася пры разбурэнні сцяны. Адпаведна, яно знаходзілася ў межах асноўнага аб'ёму храма. Гэта адрознівае яго ад іншых вядомых пахаванняў позняга сярэдневякоўя — ранняга новага часу ў храмах Паўночнай Беларусі, якія размяшчаліся ці непасрэдна пад падлогай, ці ў скляпах [1, с. 131; 3, с. 563—564, 576—577]. Адзінае вядомае ў Паўночнай Беларусі на сённяшні момант пахаванне, якое было размешчана аналагічна пахаванню Гедэона Бральніцкага, належыць епіскапу Фларыяну Грабніцкаму, было адкрыта ў нішы пры рамонце Сафійскага сабора ў 1912 г. і апісана А. П. Сапуновым [4, с. 352—353]. Можна выказаць меркаванне, што размяшчэнне пахаванняў у нішах, зробленых у сценах у межах асноўнага аб'ёму культавай пабудовы, магло быць адметнасцю практыкі пахавання архірэяў.

Што датычыцца пахавальнага інвентару, выяўленага ў адкрытым у 1747 г. пахаванні ўніяцкага епіскапа, то ён прадстаўлены адносна поўным камплектам вопраткі: сакасам, амафорам, параманам, туфлямі, а таксама крыжам-рэлікварыем. Зыходзячы з пазнакі «і г. д.» (*etc.*), колькасць дэталяў вопраткі была бо́льшай [2, с. 343]. Тэрмінам «каравака» (*caravaca*) абазначаны шасціканцовы крыж з двума перакладзінамі, верхняя з якіх карацейшая за ніжнюю. Сваю назву крыж такой формы атрымаў ад іспанскага горада Каравака-дэ-ла-Круз, дзе захоўваўся шасціканцовы крыж-рэлікварый. Ён набыў папулярнасць у час Трыдэнцкага сабора і ў свядомаці тагачасных людзей успрымаўся як надзейная абарона ад чумы. Крыж шасціканцовай формы (каравака) з сярэдзіны XVI ст. набыў пашырэнне і ў Рэчы Паспалітай [7]. Адзначым, аднак, што шасціканцовая форма не з'яўляецца асаблівасцю выключна крыжа-каравакі: аналагічную форму меў крыж Еўфрасінні Полацкай.

Крыж-рэлікварый з архірэйскага пахавання не з'яўляецца звычайным энкалпіёнам, а ўяўляе сабой элемент епіскапскага ўбрання. З названых прадметаў толькі туфлі «з выявамі крыжоў» адрозніваюцца ад убрання праваслаўнага архірэя. Гэта ўказвае на тое, што пры Гедэоне Бральніцкім строі ўніяцкіх епіскапаў яшчэ амаль нічым не адрозніваліся ад праваслаўнага архірэйскага ўбрання.

Другі фрагмент «Дзённіка…» згадвае смерць кіеўскага мітрапаліта і полацкага архіепіскапа Фларыяна Грабніцкага ў 1762 г. У адпаведнасці

з крыніцай, яго цела было перавезена з вёскі Струнне, дзе знаходзілася рэзідэнцыя мітрапаліта і дзе ён памёр, у капліцу Сафійскага сабора ў чаканні пахавання [2, с. 344]. На гэты тэкст сярод іншага абапіраўся А. П. Сапуноў пры ідэнтэфікацыі выяўленага ў 1912 г. пахавання Фларыяна Грабніцкага [4, с. 353—354]. Адпаведна, як і ў выпадку з Гедэонам Бральніцкім, Сафійскі сабор як кафедральны сабор Полацкай епархіі павінен быў стаць месцам апошняга спачыну Фларыяна Грабніцкага як полацкага архіепіскапа. Яго парэшткі былі змешчаны ў нішу злева ад алтара і замураваны. А. П. Сапуноў паведамляе аб наяўнасці адмысловай мемарыяльнай шыльды з інфармацыяй аб пахаванні Фларыяна Грабніцкага полацкім архіепіскапам Іракліем Смагаржэўскім у 1802 г. [4, с. 354]. Магчыма, трэба казаць аб перапахаванні парэшткаў архіепіскапа па нейкай прычыне праз сорак гадоў пасля смерці.

***Заключэнне***. Такім чынам, манастырская хроніка, вядомая пад назвай «Дзённік Полацкага Сафійскага манастыра», утрымлівае звесткі аб пахаванні двух полацкіх уніяцкіх епіскапаў: Гедэона Бральніцкага (верагодна) і Фларыяна Грабніцкага. Пахаванне Гедэона Бральніцкага было знойдзена ў 1747 г. пры адбудове Сафійскага сабора. Яно размяшчалася не ў склепе, а ў межах асноўнага аб’ёму храмавага будынка ў капліцы блажэннага Іасафата. Грабніца (пахавальная камера) была замуравана цэглай. Нябожчык быў апрануты ў адмысловую вопратку, якая адпавядала яго высокаму сацыяльнаму стану і статусу епіскапа: сакас, амафор, параман. Гэтыя дэталі ўбрання ўніяцкага епіскапа аналагічныя ўбранню праваслаўнага архірэя. Відавочна, што ў час дзейнасці Гедэона Бральніцкага ўбранне ўніяцкіх іерархаў амаль не адрознівалася ад убрання праваслаўных епіскапаў. Не характэрнай для праваслаўнага духавенства дэталлю вопраткі быў абутак у выглядзе туфляў з выявамі крыжоў. Такі абутак выклікаў абурэнне праваслаўных палачан, якія сталі сведкамі адкрыцця пахавання, бо яны ўбачылі ў гэтым знявагу крыжа. Дэталлю архірэйскага ўбрання быў таксама шасціканцовы крыж-рэлікварый, названы аўтарам «Дзённіка...» крыжам-каравака.

Цела другога архірэя, архіепіскапа Фларыяна Грабніцкага, пасля смерці было перавезена ў адбудаваны ім Сафійскі сабор і часова змешчана ў капліцы сабора. Гэта ўказвае на практыку пахавання ўніяцкіх епіскапаў у кафедральных саборах іх епархій. Адзначым, што парэшткі Фларыяна Грабніцкага былі таксама змешчаны ў замураванай нішы ў храме, што дазваляе выказаць меркаванне аб пахавальных нішах у межах асноўнага аб’ёму храма як аб адмысловай падкатэгорыі пахавальных помнікаў.

## Літаратура


1. Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 4. Помнікі XIV—XVIII стст. / В. М. Ляўко [і інш.] ; пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. — Мінск : Беларуская навука, 2011. — 597 с.
2. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Т. 10. — Вильна : В типографии О. Блюмовича, 1874. — VIII с. + 392 с.
3. Полоцк : Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX—XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV—XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О. Н. Левко [и др.] ; редкол. : А. А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О. Н. Левко. — Минск : Бел. навука, 2012. — 743 с. ; ил.
4. *Сапунов, А.* Чей прах покоится в нише полоцкого Софийского собора? (Доклад в ученой архивной комиссии) / А. Сапунов // Полоцко-Витебская старина. Издание Витебской ученой комиссии. Вып. II. — Витебск : Типолит. Насл. М. Б. Неймана, 1912. — С. 351—358.
5. *Улащик, Н. Н.* Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н. Н. Улащик. — М. : Наука, 1973. — 303 с.
6. *Чараўко, В. У.* Тэстаменты як крыніца па пахавальных традыцыях шляхты і мяшчан Полацкага і Віцебскага ваяводстваў XVI—XVIII стст. / В. У. Чараўко // Актуальные проблемы источниковедения : материалы V Международной научно-практической конференции к 110-летию Витебской учёной архивной комиссии, Витебск, 25—27 апреля 2019 г. / редкол. : А. Н. Дулов, М. Ф. Румянцева (отв. ред.) [и др.]. — Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2019. — С. 192—194.
7. Karawaka // Zbiór artykułów związanych z małą architekturą sakralną i historią [Электронный ресурс]. — Рэжым доступа : http://kapliczki.org.pl/kapliczki/Karawaka. — Дата доступа : 15.10.2022.
8. «Дневник Полоцкого Софийского монастыря» как источник по практике погребения высшего духовенства в XVII—XVIII вв.


## *U. V. Charauko.* «DIARY OF THE POLOTSK SOPHIA MONASTERY» AS A SOURCE ON THE PRACTICE OF BURIAL OF THE HIGHEST CLERGY IN THE 17TH-18TH CENTURIES

*The paper is devoted to the analysis of information about the burials of the bishops of the Uniate Church, found in the Polotsk St. Sophia Cathedral. In the 17th—18th centuries, bishops were buried in niches in the walls of the temple. The grave goods corresponded to the vestments of the bishop and reflected the status of the buried.*

Keywords: *funeral practice; burial of a bishop; Polotsk Sophia Cathedral.*